Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________________ С.Л. Шпарло
26.09 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД 391 э/вуч.

**МАЙСТЭРСТВА ВЯДУЧАГА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05-02 Рэжысура свят (па напрамках)*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО №78 ад 12.04.22 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя), 1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя), 1-17 01 05-03 Рэжысура свят (цыркавыя прадстаўленні)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*У. А. Трапянок,* дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*У. А. Мішчанчук,* дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар;

*А. М. Акулёнак,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай рэжысуры* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 30.08. 2022)

*прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 1 ад 14.09.2022)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Майстэрства вядучага» ўваходзіць у лік дысцыплін па выбару студэнтаў. «Майстэрства вядучага» з'яўляецца адной з неабходных высокакваліфікаваным спецыялістам у авалоданні прафесіі рэжысёра. Значнасць спасціжэння навыкаў дысцыпліны заключаецца ў разуменні і практычным прымяненні на сцэнічнай пляцоўцы, у вучэбнай аўдыторыі, падчас працы ў студыі, перад мікрафонам у іншых абставінах неабходных ведаў і ўменняў валодання арфаэпічнымі нормамі, законамі логікі мовы, уласным голасам, мімікай, целам, а таксама ступенню непасрэднага кантакта з аўдыторыяй, эмацыянальнага ўздзеяння на яе. Вучэбная дысцыпліна «Майстэрства вядучага» дапамагае засвоіць законы прамоўніцкага майстэрства, арганічнага самаадчування падчас публічнага выступлення.

Змест дысцыпліны «Майстэрства вядучага» цесна звязаны з такімі дысцыплінамі модулей як «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра», «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Моўнае дзеянне ў святах».

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага», накіравана на фарміраванне спецыялізаванай кампетэнцыі: Прымяняць метады карэкціроўкі маўленчых асаблівасцей і галасавых даных у прафесійнай дзейнасці.

Працэс навучання па дысцыпліне прадугледжвае комплексны падыход у развіцці індывідуальных галасавых асаблівасцей, акцёрскіх здольнасцей, фізічных уласцівасцей кожнага студэнта, навыкаў напісання сцэнарыяў, стылістычнай рэдактуры, пашырэння кругагляду будучых спецыялістаў. Дысцыпліна заклікана ўзбагаціць творчую прыроду кожнага з будучых рэжысёраў і педагогаў. Вучэбная праграма складаецца з псіхафізічнага, маўленча-галасавога трэнінгаў, засваення арфаэпічных норм беларускай і рускай літаратурнай мовы, практычных заняткаў працы з тэкстамі (сцэнарыі, сцэнарныя планы, падрыхтоўка да інтэрв'ю і інш.), мікрафонам, творчых спроб на сцэнічнай пляцоўцы і ў студыях гуказапісу.

Галоўнай *мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага» з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў, будучых прафесіяналаў творчай спецыяльнасці, ведаў аб прафесіі вядучага і замацаванне практычных навыкаў арганічнага існавання ў якасці вядучага разнастайных праграм, сцэнічнай самапрэзентацыі, працы з мікрафонам.

Дасягненне гэтай мэты ажыццяўляецца падчас рэалізацыі наступных *задач*:

– авалодванне арфаэпічнымі нормамі літаратурнай беларускай і рускай моў;

– вывучэнне і развіццё галасавых і псіхафізічных асаблівасцей;

– засваенне асноў сцэнарнага майстэрства і стылістычнай рэдактуры;

– авалодванне моўным дзеяннем у кантакце з аўдыторыяй;

– веданне законаў аратарскага майстэрства і механізмаў уздзеяння на аўдыторыю;

– авалодванне невербальнымі сродкамі зносін (міміка, жэсты, пагляд, рухі цела і г.д.) у спалучэнні з маўленнем;

– засваенне практычных навыкаў вядзення разнастайных праграм з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў;

– фарміраванне ўласнага стылю вядучага.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– законы логікі сцэнічнай мовы;

– арфаэпічныя нормы літаратурнай мовы;

– асноўныя характарыстыкі голасу;

– планы і перспектывы ў мове;

– асновы сцэнарнай драматургіі;

– асноўныя стылістычныя правілы рэдагавання тэкстаў для агучвання;

– віды канферанса і прафесійныя якасці канферансье, падабенства канферансье і вядучага;

– віды канцэртаў і трансфармацыю вобраза вядучага ў залежнасці ад гэтых відаў;

– жанры размоўных перадач у СМІ;

– асаблівасці працы з мікрафонам;

– спецыфіку працы з аўдыторыяй розных узростаў;

– механізмы псіхалагічнага ўздзеяння на аўдыторыю;

Студэнт павінен *умець*:

– карыстацца сваім голасам;

– самастойна пісаць і рэдагаваць тэксты і сцэнарыі;

– выразна, лагічна, пераканаўча агучваць тэксты, што маюцца, «прысвойваць» іх;

– працаваць з мікрафонам;

– вызначаць настрой аўдыторыі і трансфармаваць яго ў залежнасці ад задач праграмы;

– эмацыянальна ўздзейнічаць на аўдыторыю, прымушаць яе думаць і весці за сабой.

Студэнт павінен *валодаць*:

– практыкай «галасавога масажу» і разагрэву;

– навыкамі пошуку неабходнай інфармацыі па выбранай тэме праграмы і ўмела выкарыстоўваць яе падчас напісання сцэнарыя.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі напрамкаў спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках) агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны, складае 90 гадзін, з іх колькасць аўдыторных гадзін складае 56 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 14 гадзін, практычныя заняткі – 42 гадзіны.

Рэкамендуемай формай бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне «Майстэрства вядучага» – залік. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. Уводзіны. Змест і значэнне дысцыпліны «Майстэрства вядучага»

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага». Месца дысцыпліны ў сістэме профільных прадметаў па спецыяльнасці будучых рэжысёраў. Аб'ём, задачы і структура дысцыпліны. Характарыстыка раздзелаў дысцыпліны. Практычная скіраванасць дысцыпліны.

Паняцці «публічнае выступленне», «аўдыторыя», «праца з мікрафонам», «псіхалагічнае ўздзеянне», «інтанацыйная выразнасць», «арфаэпічныя нормы» і інш.

Адказнасць самастойнай працы студэнтаў падчас авалодвання дысцыпліны. Рэкамендаваная літаратура, аўдыя- і відэаматэрыялы па дысцыпліне.

### Тэма 2. Кіраванне дыханнем і голасам. Арфаэпічная і інтанацыйная выразнасць. Культура і логіка маўлення падчас публічнага выступлення

Падрыхтоўка галасавога апарата да працы. Валоданне нормамі арфаэпіі рускай і беларускай моў – правільнае вымаўленне гукаў, гукавых спалучэнняў. Цяжкасці двухмоўя, мелодыка мовы, палётнасць гуку і галасавы пасыл у залежнасці ад умоў працы вядучага.

Замацаванне законаў логікі мовы – маўленчыя такты, дакладны аб'ект, галоўныя паняцці і другаснае ў тэксце, вызначэнне паўз і лагічных націскаў. Тэмп і рытм вядучага канцэртнай праграмы, перадачы на радыё і тэлебачанні ў залежнасці ад яе жанру. Фразеалагізмы, метафары, гіпербалы, сінонімы, а таксама жаргоны, дыялекты, «крылатыя выразы», моўныя штампы, агаворкі, слэнг у мове вядучага. Эрудыцыя вядучага як гарант свабоды і лёгкасці падчас публічнага выступлення ці імправізацыі.

Цела вядучага – поза, жэсты, натуральнасць мімікі, позірк, уменне рухацца па сцэне. Знешні выгляд вядучага (касцюм, прычоска, грым, «праблема рук»), індывідуальнасць вядучага.

### Тэма 3. Спецыфіка сцэнарнага майстэрства і роля вядучага ў падрыхтоўцы тэкстаў.

Агульныя паняцці драматургіі – задума, тэма, ідэя, фабула, сюжэт, жанр, дзеянне, характар, канфлікт.

Стылі тэксту – навуковы, афіцыйна-дзелавы, публіцыстычны, мастацкі, размоўны. Выбар аптымальнага стылю для напісання ўласнага сцэнарыя ў залежнасці ад канцэпцыі праграмы.

Інструменты, правілы і прыёмы стварэння сцэнарыяў. Асновы сцэнарнага майстэрства. Сцэнарый як літаратурна-драматургічны твор – літаратурны сцэнарый, рэжысёрскі сцэнарый, рэжысёрская экспілікацыя. Завязка, кульмінацыя і развязка ў тэксце.

Сцэнарый і сцэнарны план на радыё і тэлебачанні. Выбар тэмы і задумы, мэта праграмы, генерацыя ідэй і іх фільтрацыя, распрацоўка канцэпцыі. Напісанне сцэнарыя – уласны тэкст, тэкст з выкарыстаннем існуючых крыніц, матэрыялаў па тэме.

**Тэма 4. Рэдактура тэкстаў**

Знаёмства з паняццямі «літаратурнае рэдагаванне» (выпраўленне лексічных, марфалагічных, сінтаксічных, стылістычных памылак; пры гэтым аўтарскі стыль захоўваецца), «сэнсавае рэдагаванне» (вызначэнне будучай структуры тэксту, затым – сэнсавае рэдагаванне згодна з выбранай структурай), «стылістычнае рэдагаванне» (прывядзенне аўтарскага тэксту да адзінага стылю), «навуковае рэгаваннне» (спецыфічнае рэдагаванне, якое прадугледжвае працу навуковага рэдактара), «мастацкае рэдагаванне» (мастацкае афармленне тэксту, якое садзейнічае інтарэсу да невядомага аўдыторыі твора).

Спецыфіка рэдагавання тэкстаў для агучвання. Эмацыянальнасць і аўтарская падача пры агучванні тэксту, пражыванне, «прысваенне» чужых тэкстаў. Значэнне паняцця «кінастужка бачання».

**Тэма 5. Майстэрства канферансье**

Законы творчасці на эстрадзе. Узнікненне жанру канферансье. Славутыя прастаўнікі канферансу.

Віды канферансу – індывідуальны, парны (дуэтны), тэатралізаваны, эстафетны (канферанс без канферансье).

Асоба канферансье і яго стылістыка працы – задачы падчас выхаду на пляцоўку (забаўляць, інфармаваць, весяліць, запаўняць паўзы і г.д.), уласная творчасць (акцёрскае майстэрства, нумар у праграме, імправізацыя), сцэнічны вобраз (маска, дасціпнасць, адукаванасць), маўленчыя асаблівасці, цесная сувязь з аўдыторыяй, партнёрамі, тэмперамент, узбуджальнасць, захопленасць. Элементы канферанса – рэпрызы, выступленне, анансаванне, уласны нумар і інш.

Пошук уласнага стылю канферансье (стварэнне маскі), драматургія ў пабудове вядзення канцэрта. Разбурэнне «чацвёртай» сцяны.

### Тэма 6. Мастацтва вядучага канцэртных праграм

Зараджэнне прафесіі і прызначэнне. Славутыя імёны і іх майстэрства. Спецыфіка працы вядучых у розныя перыяды (XX–XXI стст.). Сучасны вобраз вядучага.

Адрозненне вядучага ад канферансье: асноўная задача – інфармаваць, праца ў прапанаваных абставінах, прыемны голас, дакладная дыкцыя, знешні выгляд, унутраная ўвага, сувязь з іншымі творчымі прафесіямі і інш.

Вядзенне праграмы, кантактаванне з залай, элементы імправізацыі, творчае мысленне і непрадказальныя абставіны, праца па-за сцэнічнай пляцоўкай (прадстаўленне нумароў за кулісамі). Асаблівасці вербальнага і невербальнага ўздзеяння на аўдыторыю, «кінастужка бачання» падчас агучвання тэксту, падтэксты, тон, добразычлівасць.

### Тэма 7. Трансфармацыя вобраза вядучага

Знаёмства з відамі (філарманічная, літаратурная, эстрадная) і жанрамі (філарманічны, эстрадны) канцэртнай творчасці. Разнавіднасці канцэртнай праграмы – сольны канцэрт, зборны канцэрт, тэатралізаваны канцэрт, дзіцячы канцэрт, канцэрт-спектакль.

Спецыфіка працы вядучага ў розных па характары канцэртах. Прафесійныя якасці вядучага – урачыстасць і засяроджанасць, стрыманасць паводзін і жэстаў, правільная поза, веданне нумароў, сканцэнтраванасць і лаканічнасць у прадстаўленні нумароў, роля «гаспадара» на сцэне, даверлівыя адносіны з залай, асаблівасці паводзін і падачы тэкстаў у залежнасці ад узроставых катэгорый гледачоў, баланс ігры і арганічных натуральных паводзін, знешні выгляд, асаблівасці галасавой падачы, даверлівасць інтанацый, эмацыянальнае ўздзеянне. Рашэнне «праблемы рук» праз выкарыстанне папкі, планшэта, гаджэтаў.

Вядзенне відовішчна-забаўляльных і праграм адпачынку. Вядучы маладзёжных і дзіцячых праграм. Вядзенне праграм на адкрытым паветры. Вядучы-інфарматар, вядучы-каментатар, вядучы-акцёр, вядучы-правакатар, вядучы-арганізатар.

Стварэнне вобраза вядучага на аснове міфалагічнага, фальклорнага, літаратурнага, кінематаграфічнага і іншага матэрыялу.

Спалучэнне інфармацыйна-лагічнага (інфармацыйнае ўздзеянне на аўдыторыю) і мастацка-вобразнага (пачуццёвага) уздзеяння на аўдыторыю.

**Тэма 8. Майстэрства вядучага на радыё і тэлебачанні. Закадравае агучванне**

Гісторыя жанраў, іх функцыі, кампазіцыйныя і стылістычныя асаблівасці, магчымасці гукавога афармлення перадач, асаблівасці мантажу.

Знаёмства з інфармацыйнымі жанрамі (нататка, інтэрв'ю, рэпартаж). Асаблівасці падрыхтоўкі і стварэння інфармацыйных матэрыялаў.

Разнастайнасць аналітычных жанраў (каментарый, глоса, бяседа, шоу, агляд, рэцэнзія) і ўдзел у іх вядучага.

Значэнне і роля вядучага (выканаўцы) у дакументальных і мастацкіх жанрах (публіцыстыка, нарыс, кампазіцыя, радыёфільм, пастановачнае вяшчанне).

Асноўныя тыпажы і рысы вядучых у тэлеэфіры. Тыпажы вобраза вядучага: «вядучы-гаспадар», «вядучы-артыст», «вядучы-выдатнік», «вядучы-спадзвіжнік», «вядучы-адзіночка», «сямейныя тыпажы» тэлевядучых.

Вядучы-дыктар: майстэрства асабістай падачы абязлічанай інфармацыі.

Вядучы-субяседнік: майстэрства расстаноўкі акцэнтаў, уменне стварыць даверлівую абстаноўку.

Вядучы-публіцыст: майстэрства найбольшага ўздзеяння на аўдыторыю, уменне падзяліцца ўласнай ацэнкай рэчаіснасці.

Вядучы ток-шоу: дзейсны пасрэднік паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных груп, спецыялістаў па праблеме (напрыклад, паміж «народам» і «эспертамі»).

Прыёмы падрыхтоўкі суразмоўцаў да эфіру, «разгаворванне» іх.

Артыстычнасць як абавязковая якасць вядучых забаўляльных перадач. Эмацыянальнасць вядучых. Часавыя абставіны ў дзейнасці вядучых (ранішнія, дзённыя, вячэрнія, начныя праекты).

Атака голасу, тэмбральная афарбоўка, дыкцыя, мелодыка маўлення перад мікрафонам. Здольнасць чуць суразмоўцу, партнёра, ацэнкі і рэакцыі.

**Тэма 9. Праца вядучага з тэхнічнымі сродкамі**

Мікрафон як дапаможны сродак у працы вядучага. Асаблівасці працы з мікрафонам – дыханне, галасавая падача (сіла гуку на апоры і яго роўнасць), праца з целам, зажымы і іх зняцце, падрыхтоўка цела і маўленчага апарата да працы з мікрафонам у запісе і ў прамым эфіры.

Віды мікрафонаў – стацыянарныя, падвесныя, радыёмікрафон. Супраца з гукарэжысёрам. Баланс моцы гуку ў памяшканнях розных памераў і на адкрытай пляцоўцы.

Адлегласць паміж мікрафонам і вуснамі – гарант чысціні гучання. Практычныя рэкамендацыі знешніх паводзін у студыі гуказапісу для чысціні эфіру. Індывідуальнасць падчас працы з мікрафонам.

Імітацыя голасу падчас запісаў. Спецыфіка агучвання дакументальных матэрыялаў, запісу музычна-паэтычных кампазіцый, рэкламы, аўдыякніг, твораў для дзяцей, удзел у радыёспектаклі і г.д.

Звычка карыстацца мікрафонам.

### Тэма 10. Псіхаэмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю

Знаёмства з аўдыторыяй і падрыхтоўка да выступлення як важны спосаб уздзеяння на гледача.

«Перадстартавы рытуал» – размінка, уласны разагрэў перад выхадам на сцэну. Унутранае хваляванне і спосабы спраўляцца з ім.

Правілы авалодвання ўвагай аўдыторыі. Фізічны, энергетычны, эмацыянальны і псіхалагічны кантроль аўдыторыі. Чаргаванне эмоцый і фізічнага стану аўдыторыі. Правакаванне аўдыторыі (стварэнне эмацыянальных накалаў, выкарыстанне паўз, захаванне эмацыянальнай устойлівасці і г.д.).

Тэмперамент, энергетыка і эмацыянальнасць вядучага. Гатоўнасць да магчымых «паваротаў» глядзельнай залы, навыкі імправізацыі. Знешнія элементы прафесійнага ўздзеяння вядучага (касцюм, міміка, жэсты). Мера і густ, такт і культура, адказнасць вядучага.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### дзённая форма навучання

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін УСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | | |
| 1. | Уводзіны. Змест і значэнне дысцыпліны «Майстэрства вядучага». | 2 | | | | |
| 2. | Кіраванне дыханнем і голасам. Арфаэпічная і інтанацыйная выразнасць. Культура і логіка маўлення падчас публічнага выступлення. | | 4 | | | |
| 3. | Спецыфіка сцэнарнага майстэрства і роля вядучага ў падрыхтоўцы тэкстаў. | | 2 | | | |
| 4. | Рэдактура тэкстаў. | 2 | 2 | | 2 | праект |
| 5. | Майстэрства канферансье. | 2 | 4 | | 2 | праект |
| 6. | Мастацтва вядучага канцэртных праграм. | 2 | 6 | | | |
| 7. | Трансфармацыя вобраза вядучага. | 2 | 4 | | 2 | праект |
| 8. | Майстэрства вядучага на радыё і тэлебачанні. Закадравае агучванне | 1 | 4 | | 2 | праект |
| 9. | Праца вядучага з тэхнічнымі сродкамі. | 1 | 4 | | 2 | праект |
| 10. | Псіхаэмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю. | | 4 | | | |
| | **Усяго** | **12** | **34** | | **10** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

## Літаратура

### *Асноўная*


1. *Аверкава*, Н. К. Слоўнае дзеянне ў свяце: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках) / Н. К. Аверкава. – Мінск : БДУКМ, 2015. – 73 с.
2. Беларуская мова. Культура маўлення: даведачны дапаможнік па беларускай мове / Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту», Кафедра славянскіх і рамана-германскіх моў. – Гомель : БелДУТ, 2020. – 45 с.
3. *Ивановская*, А. Н. Культура речи : как научиться говорить красиво и грамотно / А. Н. Ивановская – Минск : Проф Пресс, 2018. – 215 с.
4. *Ивановская*, А. Н. Ораторское искусство: как сделать свое выступление достойным мишленовской звезды / А. Н. Ивановская – Минск : Энциклопедикс, 2019. – 125 с.
5. *Каляда*, А. А. Гаворка беларуская. Разговор русский : дыкцыя і арфаэнія : з электронным дадаткам / А. А. Каляда. – Мінск : Вышэйшая школа, 2020. – 215 с.
6. *Камінскі*, А. Я. Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-17 01 05 «Рэжысура свят» / А. Я. Камінскі. - Мінск : БДУКіМ, 2011. – 110 с.
7. *Котюрова*, М. П. Культура научной речи: текст и его редактирование: учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по направлению 540300 – «Филологическое образование» / М. П. Котюрова, Е. А. Баженова. – 6-е изд., стереотипное. – Москва : Флинта : Наука, 2018. – 279 с.
8. *Курлович*, В. В. Стылістыка (тэорыя і практыка): вучэбна-метадычны дапаможнік: [па дысцыпліне «Культура маўлення»] / В. В. Курловіч. – Гомель : БелДУТ, 2018. – 41, [2] с.
9. *Лебедева*, Т. В. Жанры радиожурналистики: учебное пособие / Т. В. Лебедева. – М. : Аспект Пресс, 2012. – 224 с.
10. *Смаль*, В. Н. Культура речи: учебно-методический комплекс / В. Н. Смаль. – Брест : БрГУ, 2019 – 160 с.
11. *Петрова*, Л. И. Редактирование текстов разных стилей: учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности

«Издательское дело» / Л. И. Петрова. – Минск : Республиканский институт высшей школы, 2014. – 341 с.

12. *Шагидевич*, А. А. Искусство сценической речи: учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по специальностям «Актерское искусство (по направлениям)», «Режиссура театра (по направлениям)» / А. А. Шагидевич. – Минск : БГАИ, 2018. – 259 с.

13. *Шестакова*, Е. Говори красиво и уверенно. Постановка голоса и речи / Е. Шестакова. – СПб. : Питер, 2020. – 192 с.

*Дадатковая*

1. Альшиц, Д. Н. Основы драматургии: учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности 071400.62 – Режиссура театрализованных представлений и праздников / Д. Н. Аль. – Изд. 6-е, исправленное. – Санкт-Петербург [и др.] : Лань, Планета музыки, 2013. – 279 с.

2. Анохина, В. С., Кобякова, Г. Н. Техника речи. Учебное пособие / В. С. Анохина, Г. Н. Кобякова; под ред. Н. А. Сениной. – Таганрог : Изд-во О. И. Волошина, 2019. – 175 с.

3. Быстрова, О. В. Этика ведения концертных программ и массовых мероприятий: рекомендации / Быстрова О. В. – Минск : Минский государственный дворец детей и молодежи, 2018. – 22 с.

4. Гаранец, И. Н. Этапы работы над режиссерским сценарием театрализованного представления для детей: методическая разработка / И. Н. Гаранец. – Минск : Белорусская государственная академия музыки, 2018. – 45 с.

5. Жукова, А. М., Овсянникова, О. А. Формирование музыкально-постановочной компетенции у режиссеров театрализованных представлений и праздников: монография / А. М. Жукова, О. А. Овсянникова. – Санкт-Петербург [и др.] : Москва : Лань, 2019. – 147 с.

6. Кларк, Э. А. Девять способов зарабатывать голосом. Практические советы от профессионального диктора / Э. А. Кларк ; пер. с англ. Е. Кукс. – М. : Эксмо, 2020. – 496 с.

7. Купина, Н. А. Креативная стилистика: учебное пособие / Н. А. Купина. – Москва : Флинта, Наука, 2014. – 180 с.

8. Макарова, Е. А., Мойсейчук, С. Б., Смаргович, И. Л. Технологии культурно-досуговой деятельности: пособие для работников культуры / Е. А. Макарова, С. Б. Мойсейчук, И. Л. Смаргович. – Минск : Владимир Сивчиков, 2016. – 173 с.

9. Марченко, О. И. Основы красноречия: риторика как наука и искусство убеждать: учебное пособие / О. И. Марченко. – Москва : Форум, 2016. – 207 с.

10. Мордасов, А. А. Принципы режиссуры театрализованных представлений и праздников: учебное пособие / А. А. Мордасов. – Изд. 4-е, стереотипное. – Санкт-Петербург [и др.] : Лань, Планета музыки, 2020. – 125 с.

11. Мурашов, А. А. Современная риторика: речевое воздействие и взаимодействие: монография / А. А. Мурашов. – Гродно : ГрГУ, 2012. – 286 с.

12. Непряхин, Н. Ю. Как выступать публично: 50 вопросов и ответов / Никита Непряхин. – 3-е изд. - Москва : Альпина Паблишер, 2016. – 244 с.

13. Порт, М. Затмите всех! / М. Порт, пер. с англ. Л. Г. Третьяк. – Минск : Попурри, 2017. – 240 с.

14. Риторика: для тех, кто хочет все успеть: история риторики, речевое воздействие и манипулирование, упражнения для ораторов, эффективное построение речи. – Москва : Эксмо, 2018. – 124 с.

15. Фишер, Дж., Кейс, Г. Голос. 99 упражнений для тренировки, развития и совершенствования вокальных навыков / Дж. Фишер, Г. Кейс ; пер. с англ. Д. Халиковой. – М. : Азбука Бизнес, Азбука-Аттикус, 2019. – 192 с.

16. Фрумкин, Г. М. Сценарное мастерство: кино – телевидение – реклама: учебное пособие: для студентов, обучающихся по специальности 350700 — реклама: [для творческих специальностей] / Г. М. Фрумкин. – Москва : Академический проект, 2017. – 222 с.

17. Шароев, И. Г. Режиссура эстрады и массовых представлений: учебник / И. Г. Шароев. – 4-е изд., исправленное. – Москва : ГИТИС, 2014. – 339 с.

18. Шубина, И. Б. Драматургия и режиссура зрелищных форм. Соучастие в зрелище, или Игра в миф: учебно-методическое пособие / И. Б. Шубина. – Изд. 2-е, стереотипное. – Санкт-Петербург [и др.] : Лань, Планета музыки, 2018. – 238 с.

## Рэкамендаваныя метады навучання

Матэрыял выкладаецца на аснове сучасных метадычных патрабаванняў з улікам узроўню ведаў студэнтаў. Пры чытанні лекцый асаблівая ўвага надаецца разгляду тэарэтычных асноў пошуку і даследавання неабходнай інфармацыі па тэме дысцыпліны і яе перапрацоўцы, практычнага прымянення атрыманых ведаў у вучэбнай дзейнасці і ў розных напрамках сферы культуры і мастацтва.

Практычныя заняткі накіраваны на фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў, выкарыстанне атрыманых тэарэтычных ведаў пры выкананні канкрэтных заданняў па тэматыцы навучальнай дысцыпліны. Методыка правядзення ўказаных заняткаў павінна садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей кожнага студэнта і набыццю навыкаў самастойнай работы. Варта прымяняць новыя формы арганізацыі працэсу навучання: візуалізаваныя лекцыі, выкарыстанне аўдыя- і відэаматэрыялаў, калектыўная практычная праца, дзейнасць у студыях гуказапісу і да т.п.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для выяўлення і выключэння прагалаў у ведах студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі:

– франтальнае апытанне на лекцыях, практычных занятках;

– абарона выкананых на практычных занятках работ;

– выкананне творчых заданняў і іх афармленне, якія прадугледжваюць самастойны выбар метаду рашэння задачы;

– кансультацыі і субяседванне.

Для вызначэння ступені адпаведнасці навучальных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць праектную дзейнасць, якая ўключае праблемныя, творчыя задачы, што дапускаюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Кіруемая самастойная работа студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне «Майстэрства вядучага». Мэта самастойнай працы студэнтаў – садзейнічанне засваенню ў поўным аб’ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль уласнай дзейнасці, практычнае ўвасабленне атрыманых ведаў. Выкладчык дае заданні па самастойнай рабоце і рэгулярна правярае іх выкананне.

Змест і формы самастойнай работы студэнтаў, якая кантралюецца, рэкамендуецца непасрэдна звязваць з выкарыстаннем метаду творчых праектаў, што дазваляе рэалізоўваць індывідуальны падыход да навучання. Падчас працы над праектамі студэнты лепш паглыбляюцца ў прадметную вобласць.

Такая арганізацыя работы садзейнічае развіццю прафесійнай кампетэнцыі.

## Крытэрыі ацэнкі ўзроўню ведаў і ўменняў студэнтаў

**Заліку** заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковае і сістэматычнае, або частковае (з невялікімі памылкамі) веданне вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны, выканаў усе ці большасць заданняў, дадзеных для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, а таксама знаёмы з матэрыялам, не запланаваным праграмай; актыўна працаваў на лекцыйных, практычных і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне.

Студэнт, які засвоіў і аперыруе асноўнай і рэкамендаванай для самастойнага вывучэння літаратурай, выказвае свае меркаванні па прадмецы, дакладна карыстаецца тэрміналогіяй, паказвае жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.